PREZES
KRAJOWEJ RADY
RADCÓW PRAWNYCH

KRAJOWA IZBA
RADCÓW PRAWNYCH

00-478 Warszawa, Aleje Ujazdowskie 18 lok. 4
tel. 22 821 99 71, 821 99 72, 626 82 49 • e-mail: kirp@kirp.pl • NIP: 526-10-43-011

Варшава, 14 мая 2021 г.

**Нацыянальны савет адвакатаў Рэспублікі Беларусь**

Нацыянальная рада юрыдычных кансультантаў, якая прадстаўляе самакіраванне юрыдычных кансультантаў і юрысконсультаў-стажораў у Польшчы, выказвае глыбокую занепакоенасць той інфармацыяй, якая паступае ад міжнароднай супольнасці юрыстаў і з агульнадаступных крыніц. Паводле гэтай інфармацыі, 19 адвакатаў і адвакатак былі выключаны са спісу асобаў, упаўнаважаных выконваць гэту прафесію. Здаецца верагодным, што рашэнне аб пазбаўленні правоў гэтых людзей з'яўляецца вынікам, у прыватнасці, іх ранейшай дзейнасці, якая заключалася ў абароне асоб, затрыманых падчас пратэстаў, што прайшлі ў Беларусі пасля апошніх прэзідэнцкіх выбараў, а таксама прадстаўлення актывістаў палітычнай апазіцыі.
Самакіраванне юрысконсультаў і яго члены надаюць вялікае значэнне шанаванню правоў чалавека, верхавенству закона і незалежнасці юрыдычных прафесій у Еўропе і ў свеце. Для нас надзвычай важнай справай з'яўляецца абарона юрыстаў, чые правы парушаюцца, незалежна ад таго, дзе яны практыкуюць,

Улічваючы вышэйсказанае,а мы заяўляем аб падтрымцы Нацыянальнага савета адвакатаў Рэспублікі Беларусь у мерапрыемствах, накіраваных на абарону правоў яго членаў.

Прэзідэнт
Нацыянальнай рады юрысконсультаў

Уладзімір Хрусцік